# ДА 85-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

# УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА



30 лістапада студэнты Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта наведалі Цэнтральную гарадскую бібліятэку імя А.Макаёнка г.Гродна, дзе яшчэ раз было ўшанавана імя знакамітага беларускага пісьменніка **У.Караткевіча**. Супрацоўнікі бібліятэкі, старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Мікалаеўна Тарасава падрыхтавалі для слухачоў праграму, дзе прагучалі вершы У.Караткевіча, музычныя творы, адбыўся прагляд дакументальнага фільма па творчасці пісьменніка. Бібліятэка прэзентавала студэнтам бібліяграфічны паказальнік літаратуры па творчасці У.Караткевіча "Рамантычны рыцар чалавечнасці", які можа быць карысным пры напісанні курсавых і дыпломных прац.

ПРЭС-СЛУЖБА СПБ-ГРОДНА

***На здымках:*** святочная праграма да 85-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча з удзелам студэнтаў і старшага выкладчыка кафедры беларускай літаратуры ГрДУ ім. Я.Купалы, члена Саюза пісьменнікаў Беларусі С.М.Тарасавай. Гродна, Цэнтральная гарадская бібліятэка імя А.Макаёнка. 30 лістапада 2015 года.







